# Мастацтва і мастацкая адукацыя

## (З мастацкага жыцця Нясвіжа XVI—XVIII стст.)

**В.П.Пракапцова**

Мастацкае жыццё пэўнай эпохі, краіны, горада ўбірае ў сябе вялікую разнастайнасць відаў творчай дзейнасці, накіраванай на асэнсаванне і фарміраванне духоўнасці чалавека і грамадства. Мастацкае афармленне быту, мастацтва культавага і свецкага асяроддзя, функцыянаванне новых формаў распаўсюджвання мастацтва (канцэрты, галерэі, тэатральныя спектаклі), станаўленне яго выхаваўчых і адукацыйных функцый, і, канечне ж, тое высокае, чыстае мастацтва, якое спрадвеку несла ў свет прыгажосць і выхоўвала чалавечыя душы, — усё гэта састаўляючыя цэласнай з'явы, якая называецца "мастацкае жыццё".

Па меры развіцця творчай дзейнасці і змянення яе сацыяльных функцый уздзеянне мастацтва на жыццё чалавека станавілася ўсё больш важным і складаным. Сёння мы ўжо можам разважаць аб шматлікіх пунктах погляду на шляхі фарміравання мастацкага жыцця, аб разнастайнасці ролі мастацтва ў жыцці грамадства розных гістарычных эпох. Перыяд XVI—XVIII стст. на Беларусі ахоплівае такія мастацка-стылістычныя эпохі, як Адраджэнне, Барока, Асветніцтва, Класіцызм. Кожная з іх мае свае асаблівасці ў фарміраванні мастацкага жыцця, свае эстэтычна-тэарэтычныя абгрунтаванні.

У эпоху Адраджэння адным з галоўных аб'ектаў філасофскіх даследаванняў стала ідэя чалавека гарманічнага, унутрана багатага, чалавека, які ўзбагачаецца дзякуючы мастацтву. Сярод мысліцеляў-гуманістаў XVI ст. на Бела-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

русі вызначыўся Сымон Будны (1530—1593), дзейнасць якога была звязана з Нясвіжам. Тут ён сумесна з нясвіжскім намеснікам Мацеем Кавячынскім і кальвініскім прапаведнікам Лаўрэнціем Крышкоўскім заснаваў друкарню, пры якой была пабудавана і паперня. Сымон Будны абгрунтаваў думку пра пазнавальнае значэнне мастацтва і яго маральна-выхаваўчую ролю. Ён лічыў, што поўнае самавыяўленне асобы, росквіт здольнасцей чалавека магчымы толькі на аснове свабоды. С.Будны дбаў за школьную адукацыю, эканамічную падтрымку настаўнікаў, бедных вучняў, прапаведнікаў, праграміраваў накіраванне даходаў на будаўніцтва бальніц і дамоў для састарэлых.

У мастацкае жыццё Нясвіжа ўваходзяць самыя розныя віды дзейнасці мастакоў, музыкантаў, выкладчыкаў. У гэты час закладваюцца трывалыя асновы драматычнага і музычнага тэатра, дэкарацыйна-афарміцельскага мастацтва, партрэтнага жывапісу і г.д. З'яўляюцца новыя формы захавання і прапаганды твораў выяўленчага мастацтва — ствараюцца галерэі партрэтаў, функцыянальна пашыраецца дзейнасць кампазітараў, у творчасці якіх асноўная ўвага засяроджваецца на музыцы свецкага характару. У гэты час фарміруецца і такі новы від дзейнасці ў галіне мастацкай культуры, як мецэнацтва.

Гісторыя мецэнацтва звязана з уласнай дзейнасцю і асабістым імем выхадца са знакамітага этрускага роду, багатага конніка, рымскага грамадзяніна Мецэната. Ён падтрымліваў маладых паэтаў — Вергілія, Гарацыя, Праперцыя (I ст. да н.э.), дапамагаў ім матэрыяльна і выкарыстоўваў іх творчасць для праслаўлення імператара Аўгуста. Імя Мецэната стала нарыцацельным і перайшло ў назву з'явы ў мастацкім жыцці, якая вызначае бескарыслівую падтрымку творцаў.

Спробу тэарэтычна асэнсаваць такі грамадскі інстытут, як мецэнацтва, зрабіў і дзеяч беларускай культуры канца XVI—пачатку XVII ст., пісьменнік, перакладчык і каментатар твораў антычных аўтараў Беняш Будны. Нарадзіўшы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ся ва ўладаннях Кішкаў у мястэчку Лоск, ён з 1594 г. служыў эканомам у Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі. Займаўся пераважна пісьменніцкай і перакладчыцкай дзейнасцю. У асноўным перакладаў антычную літаратуру, напрыклад трактат Цыцэрона "Пра старасць". Відаць, цікавасць да антычнай культуры і абумовіла яго жаданне асэнсаваць мецэнацтва. Ён пісаў: "Сярод людзей, якія займаюцца навукамі, існуе старажытны звычай: кнігі, што выдаюцца, прысвячаць сваім дабрадзеям, пра якіх ходзіць чутка, што яны вельмі паважаюць музы і навукі...".

Так, знакаміты філосаф Арыстоцель прысвячаў некаторыя працы свайму гаспадару, Вергілій свае "Георгікі" — вяльможнаму пану Мецэнату... "Неабходна, каб людзі бачылі, што навука і чытанне займаюць не апошняе месца. Вядома, што простым людзям падабаецца займацца тым, што паважаюць знатныя асобы і паны" (Мысліцелі і асветнікі Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. — Мінск, 1995. — С. 188).

Беняш Будны лічыў, што быць апекуном вучоных і пісьменнікаў — вялікі гонар. Толькі дабрачынны, адукаваны чалавек, які любіць сваю Бацькаўшчыну, можа заслужыць такі гонар. У сваю чаргу, як сведчыў Беняш Будны, пісьменнікі, мастакі, вучоныя, прысвячаючы мецэнатам свае творы, робяць іх імёны бессмяротнымі.

Характэрныя прыметы мецэнацтва ў Нясвіжы звязаны з родам Радзівілаў. Адным з першых апекуноў творцаў стаў уладальнік Нясвіжа ў першай палове XVI ст. Мікалай Радзівіл Чорны (1515—1565). Займаючы афіцыйную дзяржаўную пасаду канцлера Вялікага княства Літоўскага, ён адыграў вялікую ролю ў развіцці мецэнацтва ў розных сферах культуры Беларусі і Літвы і найбольш за ўсё ў арганізацыі кнігадрукавання.

Як мецэнат праславіўся і Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка (1549—1616). З'яўляючыся маршалкам вялікім літоўскім, ён меў магчымасць запрашаць мастакоў, як мясцовых, так і замежных, вызначаць пэўныя творчыя заказы, выбарачна аказваць падтрымку творцам, фарміраваць пэўныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патрабаванні да нараджэння твораў. Менавіта Мікалай Радзівіл Сіротка паклаў пачатак стварэння выдатнай галерэі партрэтаў у Нясвіжы, як прыклад так званых “галерэй продкаў”, што былі шырока прадстаўлены ў маёнтках амаль усіх буйных магнатаў Беларусі. Таксама намаганнямі Сіроткі ў Нясвіжы пры езуіцкай калегіі ў 1584 г. была адкрыта школа. Разам з жонкай там жа ён пабудаваў два манастыры — жаночы бенедыкцінскі (1590) і бернардынскі (1598).

Мецэнацкай дзейнасцю займаўся і маршалак надворны, гетман вялікі літоўскі Міхаіл Казімір Радзівіл Рыбанька (1702—1762). У Нясвіжы ён аднавіў разрабаваныя ворагамі каштоўнасці — бібліятэку, друкарню, калекцыю мастацкіх твораў, з'явіўся стваральнікам першых на Беларусі мануфактур — фаянсавай, габеленавай, шаўковых паясоў. Разам са сваёй жонкай Францішкай Уршуляй Радзівіл Рыбанька таксама стварыў самы вялікі на Беларусі прафесійны тэатр таго часу і прыдворную інструментальную капэлу.

Канечне ж, мецэнацкая дзейнасць часцей за ўсё мела ідэалагічныя, прадстаўнічыя і прэстыжныя мэты. Сродкамі мастацтва праслаўляўся род Радзівілаў, яго гістарычная магутнасць і значнасць. Як, напрыклад, у знакамітым серыяле габеленаў, які адлюстроўваў найбольш важныя эпізоды з гісторыі роду Радзівілаў — “Каранацыя Барбары Радзівіл”, “Бітва князя Януша Радзівіла пад Кіевам” і інш.

Тым не менш разуменне значнасці мастацтва, яго выхаваўчай ролі і асэнсаванне яго месца ў грамадскім жыцці абумовіла гістарычна неабходнае фарміраванне механізма сацыяльнага заказу ў галіне мастацтва, стварэння ўмоў для матэрыяльнага забеспячэння мастакоў, музыкантаў, акцёраў.

Мастацкае жыццё Нясвіжа ў XVI—XVIII стст. было прадстаўлена даволі разнастайнымі формамі бытавання мастацтва. У гэтыя стагоддзі тут сфарміраваўся больш шырокі па ахопе формаў, відаў і жанраў і больш прафесійны па сутнасці і спосабам увасаблення падыход да мастацтва. У мастацкае жыццё Нясвіжа ўваходзяць новыя па стылі і

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

складаныя па архітэктуры збудаванні (напрыклад, палацава-замкавы комплекс, касцёл езуітаў), фарміруюцца і праслаўляюцца ў Еўропе такія віды выяўленчага мастацтва, як ткацтва габеленаў і выраб шаўковых і літых паясоў, манументальны роспіс, удасканальваецца жанр партрэта. У музычнае жыццё Нясвіжа ўваходзяць складаныя жанры опернай, інструментальна-аркестравай музыкі, фарміруюцца нацыянальныя традыцыі музычнага і харэаграфічнага выканальніцтва, закладваецца трывалая аснова драматычнага, опернага і балетнага тэатра ў Беларусі.

Мастацкае жыццё Нясвіжа фарміравалі як запрошаныя Радзівіламі заходнееўрапейскія дзеячы — архітэктар Джавані Бернардоні, кампазітары Ян Дусік, Ян Давід Голанд, Джаакіна Альберціні, музыканты-педагогі Вінчэнца Ніканіні, Джузэпе Канстанціні, харэографы Якуб Аліўе, Гэатан Петынецы, дырыжор Д.Кернер, так і мясцовыя майстры — мастакі Тамаш Макоўскі, Ксаверый Даменік і яго сын Юзаф Ксаверый Гескія, Ф.Вітаноўскі, харэограф Антон Лойка, капельмайстар Е.А.Бакановіч, скрыпач Ян Цэнціловіч і г.д.

Мастацкае жыццё станавілася тым неабходным асяроддзем, без якога не мог фарміравацца сацыяльны быт. Зварот да пэўных жанраў мастацтва абумоўліваўся ў большасці выпадкаў функцыянальнай неабходнасцю і ўмовай праслаўлення роду Радзівілаў. Так, адной з лепшых прац Т.Макоўскага лічыцца "Панегірык братоў Скарульскіх — Яна, Захара і Мікалая", які быў напісаны студэнтамі нясвіжскага езуіцкага калегіума ў гонар Радзівіла Сіроткі ў сувязі з прызначэннем яго ў 1604 г. на пасаду віленскага ваяводы. Цікава, што гэты дастаткова вялікі кніжны медзярыт і надрукаваны быў у Нясвіжы, што сведчыць аб наяўнасці там складанага абсталявання для друкавання медзярытаў. Пацвярджэннем думкі, што жанры, якія распрацоўваліся ў выяўленчым мастацтве, пакуль насілі прыкладны характар, можа служыць творчасць мастакоў Гескіх. Творы, над якімі яны працавалі, заказваліся ў адпаведнасці з функцыя-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

нальным прызначэннем: карціна "Тайная вячэра" галоўнага алтара Нясвіжскага касцёла езуітаў, фрэскі ў ім. дэкарацыі да "камедыегаўза" ў Нясвіжы, кардоны для габеленаў, якія выканаў Ксаверый Гескі, партрэты Радзівілаў, афармленне нясвіжскіх даменіканскага касцёла і замка, што падрыхтаваў Юзаф Гескі.

Найбольш выразна вызначаюцца функцыянальныя задачы музычнага жыцця Нясвіжа. У першай палове XVII ст. яшчэ захоўваюцца стылістычныя традыцыі поліфанічнай музыкі эпохі Адраджэння. У гэтым сэнсе прыкладам можа быць творчасць арганіста і кампазітара Андрэя Рагачэўскага, які служыў пры двары канцлера Альбрэта Радзівіла ў Нясвіжы. Сярод іншых твораў ім былі напісаны дзевяцігалосны матэт (харавы твор на рэлігійны тэкст) для двух хораў і чатырохгалосная канцона (песня).

У XVIII ст. музыка стала абавязковай "удзельніцай" святочных цырыманіялаў — калі сустракалі шаноўных гасцей, адзначалі дзень нараджэння караля ці магната, збіраліся на паляванне, святкавалі вяселле. Музыка суправаджала пышныя застоллі і абавязкова гучала на балях. Сярод танцаў, якія выконваліся, былі менуэт, англез, гавот, мазурка, паланэз. У гэтых выпадках выконваліся творы як заходнееўрапейскіх кампазітараў, так і аўтараў, якія працавалі ў Нясвіжы — Яна Давіда Голанда, Яна Дусіка, Джаакіна Альберціні. Па фунцыянальным прызначэнні вызначаліся і аркестры — камерныя (так званая "хатняя музыка"), духавыя (ваенныя, рагавыя, янычарскія), народных інструментаў (так званая "літоўская музыка"). У Нясвіжы была вельмі багатая калекцыя музычных інструментаў, практычна налічваліся амаль усе інструменты класічнага сімфанічнага аркестра: скрыпкі, басэтлі, віяланчэлі, басы, флейты, габоі, фаготы, трубы, валторны, ударныя, клавікорды, фартэпіяна.

У другой палове XVIII ст. у Нясвіжы існавала і інструментальная майстэрня, дзе працавалі майстры, якія выраблялі і рамантавалі музычныя інструменты — нямецкі май-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стра Міхаэль Дэн і мясцовыя Сцяпан Юшкевіч, Міхаіл Craновіч, Фёдар Крыжкевіч, Кароль Буржынскі, Матэвуш Чарняўскі, Фрыдрых Занкевіч, Міхаіл Катлярэвіч.

Важным цэнтрам мастацкага жыцця Нясвіжа станавіўся, зразумела, тэатр — школьны і прыватнаўласніцкі. Езуіцкі школьны тэатр існаваў у Нясвіжы ў 1696—1758 гг. Пастаноўкі ў ім розных спектакляў — драматычных, музычна-драматычных, з удзелам балета — сведчаць аб развіцці музычна-тэатральных жанраў і пашырэнні такіх з'яў, як мецэнацтва і выдавецкая дзейнасць. Так, у сувязі з прадстаўленнем у 1723 г. драмы "Відовішча свету" вядомым становіцца імя мясцовага мецэната Хрыстафора Кандратовіча. А надрукаваныя праграмы і тэксты трагедый, якія выдаваліся ў Нясвіжы ў сярэдзіне XVIII ст., пашыраюць нашы ўяўленні аб друкарскіх магчымасцях горада і аб значнасці, якая надавалася тэатру як цэнтру мастацкага жыцця.

У сувязі з дзейнасцю школьнага тэатра нельга не прыгадаць імя новалацінскага паэта, філосафа, тэолага, тэарэтыка літаратуры і красамоўства і, як адзначаюць даследчыкі, таксама і таленавітага музыканта Мацея Сарбеўскага (1595—1640), які ў 1625—1626 гг. працаваў у Нясвіжскім езуіцкім калегіуме і ўдзельнічаў у стварэнні рэпертуара школьнага тэатра. У сваёй "Паэтыцы" ён адзначаў адметнасць усіх сродкаў выразнасці спектакля, сінтэтычнае адзінства ігры акцёраў, музычнага і дэкарацыйнага афармлення, асвятлення спектакля.

Адкрыццю прыватнаўласніцкага таэтра Радзівілаў стала значная падзея не толькі для мастацкага жыцця Нясвіжа, але і для фарміравання тэатральнай культуры ўсёй Беларусі. Бо ў 1748 г. з'явілася першае на беларускай зямлі стацыянарнае тэатральнае памяшканне, якое змяшчала 1000 чалавек. Нясвіжскі тэатр стаў той асновай, дзе ўстанавіўся цесны саюз паміж музыкай, харэаграфіяй, сцэнічнай дзеяй. Пабудовай гэтага будынка, перарobленага з княжыцкага манежа, займаўся архітэктар К.Ждановіч. У аздабленні тэат-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ра прымалі ўдзел мясцовыя мастакі К.Д.Гескі, М.Скажыцкі, Мікадаеўскі, якія, магчыма, мелі дачыненне і да стварэння дэкарацый. Пазней, у сярэдзіне 1780-ых гг., над афармленнем тэатральных пастановак працавалі мясцовыя мастакі С.Цыбульскі, Мартэльмонс, а таксама спецыяльна запрошаны для стварэння дэкарацый для "Агаткі" К.Атасельскі. Тэатр станавіўся важным цэнтрам мастацкага жыцця ў эпоху Асветніцтва, калі мастацтва заваёўвала ўсё больш шырокае сацыяльнае прызнанне.

Сярод іншых відаў мастацтваў у другой палове XVIII ст. вядучае становішча ў мастацкім жыцці займае оперна-балетны тэатр, што адпавядала заканамернасцям развіцця заходнееўрапейскай тэатральнай культуры XVIII ст. У рэпертуары тэатра значыліся такія оперы італьянскіх кампазітараў, як "Фраскатанка, ці Залатая дзева" Дж.Паізіела, "Джаніна і Бернардоне" Д.Чымароза, "Сялянскія сцэны рэўнасці" Дж.Сарці.

Важным для фарміравання нацыянальнага тэатра сталі оперы, створаныя ў Нясвіжы — "Шчаслівае няшчасце", "Сляпое каханне не зважае на вынікі" (мастак М.Жукоўскі, 1752 ), "Дасціпнае каханне" (1746), аўтарам драматургіі якіх стала Уршуля Радзівіл, а таксама "Агатка, ці прыезд пана" (кампазітар Ян Голанд, мастак К.Атасельскі, вершаваны тэкст Мацея Радзівіла, 1784) і "Войт альбанскага паселішча" Мацея Радзівіла (1785).

Шырыня і разнастайнасць сфер мастацкага жыцця патрабавала падрыхтоўкі выканаўчых творчых кадраў. У гэтым сэнсе ў Нясвіжы развівалася даволі шырокая і трывалая мастацка-адукацыйная сістэма. Мастацкая адукацыя (а сюды адносіцца музычная, тэатральная адукацыя і навучанне ў галіне выяўленчага мастацтва) фарміравала тыя неабходныя творчыя прынцыпы, якія пранізвалі мастацкую практыку.

Накірункі, па якіх ішло навучанне ў пэўных установах, абумоўліваліся культавым і свецкім асяроддзем. Сярод канфесійных навучальных установаў вызначаюцца бурсы, засна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваныя каталіцкай царквой, брацкія школы, якія ствараліся праваслаўнымі ўстановамі, а таксама езуіцкія калегіумы. Навучанне тут насіла дыдактычны, функцыянальна накіраваны характар.

Сам прынцып арганізацыі мастацкага жыцця Нясвіжа, дзе перамяжоўваліся і суіснавалі побач розныя віды мастацтва і розныя формы яго рэпрэзентацыі, абумоўліваў і прынцып выкладання, навучання і зносін педагога з вучнем. Больш яскрава шматмэтавасць адукацыі назіраецца ў агульнаадукацыйных установах, напрыклад у калегіумах. Тут самі выкладчыкі станавіліся аўтарамі п'ес, паводле якіх ставіліся школьныя спектаклі, галоўнай мэтай якіх часта было вырашэнне не столькі мастацкіх задач, колькі прэстыжных і утылітарна-дыдактычных. Драмы будаваліся паводле канонаў, што выкладаліся вучням у тэарэтычных курсах рыторыкі і паэтыкі. Прыкладам у гэтым сэнсе можа стаць дзейнасць М.Сарбеўскага. Аб шматпрофільнасці выкладчыка працы сведчыць і дзейнасць Яна Тадэвуша Клаўса, які ў Нясвіжскім калегіуме ў пачатку XVIII ст. выкладаў спевы, тэалогію, а таксама арганізоўваў тэатральныя і школьныя святочныя прадстаўленні, для якіх сам разам з вучнямі рыхтаваў і цікавыя дэкарацыі.

Да тэатральных паказаў рыхтавалі таксама і навучэнцаў устаноў, якія адносіліся да зусім далёкай ад тэатра сферы — вайсковай. Выхаванцы нясвіжскай кадэцкай "Рыцарскай школы" і школы флоцкіх афіцэраў у Альбе ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы сцэнічных выступленняў — драматычных і балетных, падрыхтоўку да якіх забяспечваў Я.П.Фрычынскі.

Функцыянаванне спецыяльных музычнай, тэатральнай, балетнай школ зыходзіла з рэалій мастацкага жыцця Нясвіжа і было абумоўлена дзейнасцю прыватнаўласніцкага тэатра. Балетная школа існавала ў 1758—1790 (?) гг., дзе першым кіраўніком стаў Л.М.Дзюпрэ (у 1758—1760 гг.) — адзін з заснавальнікаў мужчынскага класічнага танца. У школе таксама выкладалі французскі "мэтр танцаў" Якуб Аліўе

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

(з 1762 г.), прыгонны балетмайстар Антон Лойка (з 1779 г.), Гаэтан Петынеці (з 1780 г.). У гэты ж перыяд (1760—1780 гг.) дзейнічала і спецыяльная тэатральная школа.

Дзейнасць Нясвіжскай капэлы — прыдворнага аркестра князёў Радзівілаў, які існаваў у 1724—1809 гг., і Нясвіжскага тэатра Радзівілаў (1740—1791) забяспечвалася ў пэўнай ступені функцыяніраваннем музычнай школы. Вызначальным прынцыпам фарміравання музычнага асяроддзя стала эстэтыка свецкага мастацтва з багаццем аркестравага гучання, сольнага выканальніцтва, прыгажосці вакальнага гучання. Вучняў, якіх набіралі з сялян Нясвіжа і навакольных вёсак, вучылі ігры на скрыпцы (выкл. Дж.Канстанціні), віяланчэлі (выкл.І.Фляйшман), флейце (выкл. Кенітцэр), габоі (выкл. Я.К.Фішэр), фагоце (выкл.Ф.Хофман), валторне (выкл.Вентцэль), трубе, басе. Выкладчыкамі вакала былі В.Нікаліні, Калаўш, Герман. Зразумела, што выкладчыкі, як інструменталісты, так і вакалісты, былі і асноўнымі выканаўцамі ў капэле і оперным тэатры.

Капельмайстрамі капэлы працавалі Е.А.Бакановіч (з 1749 г.) і прыгонны скрыпач Я.Цэнпіловіч (з 1751 г.), дырыжорамі таксама працавалі Ф.Вітман (з 1756 г.), Я Шоль (клавісініст, з 1761 г.), Д.Кернер (з 1770 г.), якія таксама выкладалі ў школе. Акрамя названых, педагагічнай дзейнасцю займаліся Я.Голанд (клавісін), Я.Дусік (фартэпіяна). Дж.Альберціні (клавесін, капельмайстра).

Арганізацыя мастацкай адукацыі патрабавала і пэўнага забеспячэння падручнікамі. Яны рыхтаваліся педагогамі-практыкамі і навукоўцамі. Своеасаблівымі метадычнымі дапаможнікамі пры жывапісным аздабленні храмаў, выкананні ікон, падрыхтоўцы кардонаў для габеленаў сталі графічныя друкаваныя выданні, так званыя “кажбушкі”. “Кажбушкі” сталі асноўнымі дапаможнікамі для малявання і ў разьбярстве, гравюры беларускіх, украінскіх, заходнееўрапейскіх старадрукаваных кніжак выкарыстоўваліся ў якасці ўзораў для мастацкага афармлення арганаў, інтэр`ераў касцёлаў, дэкаратыўнага афармлення ікон і г.д. Для ства-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэння аб'ёмнай дэкаратыўнай разьбы выкарыстоўваўся вялікі набор інструментаў. Напрыклад, у інвентары Нясвіжа 1779 г. узгадалі 32 назвы і 100 відаў цяслярных інструментаў.

У галіне музычна-тэатральнай неабходна нагадаць імёны двух дзеячаў, якія працавалі ў Нясвіжы і звярталіся да напісання падручнікаў — Сігізмунда Ляўксміна (1596—1670) і Арнульфа Варанца. С.Ляўксмін у сваёй разнастайнай дзейнасці шмат увагі ўдзяляў тэатральнай і музычнай адукацыі. У Нясвіжы з 1631 па 1635 г. ён выкладаў паэтыку, а ўвогуле займаўся філасофіяй, музычнай і літаратурнай дзейнасцю. С.Ляўксмін стаў аўтарам першых айчынных падручнікаў па грэчаскай мове, музыцы і рыторыцы. Яго праца "Практычнае красамоўства, або Правілы рытарычнага мастацтва" выкарыстоўваліся ў XVII—XVIII стст. як падручнік і выдавалася два разы ў Рэчы Паспалітай і адзінаццаць разоў у гарадах Заходняй Еўропы.

Арнульф Варанец працаваў у Нясвіжы ў канцы XVIII ст. Абат бенедыкцінскага манастыра, хармайстар і тэарэтык музыкі, ён стварыў прыкладна ў 1794 г. падручнік "Пачаткі музыкі як фігуральнага, так і харальнага канта", які быў выдадзены ў Вільні ў 1809 г. Гэтую працу прапаноўвалася выкарыстоўваць пачынаючым студэнтам. Падручнік складаўся з 15 глаў, дзе даваліся асноўныя звесткі аб тэорыі музыкі, і дадаткаў, у якіх быў распрацаваны слоўнікавы пераклад італьянскіх музычных тэрмінаў.

Так, мастацкае жыццё ва ўсіх яго праявах было пастаянным асяроддзем гараджан і арыстакратыі Нясвіжа ў XVI—XVIII стст. Мастацтва, мастацкае жыццё пераставала быць простым упрыгожваннем сацыяльнага быта ці лёгкім баўленнем часу. Яно станавілася сведчаннем высакароднасці і прыстойнасці жыцця ў маральным і педагагічным сэнсе, сімвалам сацыяльнага і культурнага ўдасканалення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ